Deutsche Gesellschaft
für Auswärtige Politik e.V.

**Forschungsinstitut**

## Конкурсны набор 2015/2016

## у на праграму каледжа імя Карла Фрыдрыха Герделера «Якасць дзяржаўнага і грамадскага кіравання» (Good Governance) Фонду імя Роберта Боша у супрацоўніцтве з Нямецкім таварыствам знешняй палітыкі (DGAP)

Паважанае спадарства!

Я хацеў бы звярнуць Вашу ўвагу на праграму каледжа імя Карла Фрыдрыха Гёрделера «Якасць дзяржаўнага і грамадскага кіравання» (Good Governance). Каледж займаецца павышэннем кваліфікацыі маладых кіруючых кадраў з Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы, Расіі, Турцыі і Украіны ў сферы якасці дзяржаўнага і грамадскага кіравання, і ўплывае, такім чынам, на ўмацаванне установ грамадскага сектара (адміністрацыйнае кіраванне, грамадскія арганізацыі) і эканомікі.

У якасці дырэктара каледжа на працягу некалькіх гадоў я суправаджаю гэтую праграму і звяртаюся да Вас з просьбай падтрымаць абвешчаны конкурсны набор удзельнікаў. Распаўсюдзьце, калі ласка, інфармацыю аб праграме сярод сваіх дзелавых калег, і прапануйце кваліфікаваным супрацоўнікам падаць заяўку на ўдзел у конкурсе.

Праграма каледжа разлічана на кіруючыя кадры з шматгадовым вопытам прафесійнай дзейнасці ў сферы публічна-прававога ўпраўлення, у камерцыйных прадпрыемствах і грамадскіх арганізацыях. Перадумовай для ўдзелу ў конкурсе з'яўляюцца наяўнасць дыплома вышэйшай адукацыі, цікавасць да павышэння якасці дзяржаўнага і грамадскага кіравання і да палітычнага ладу мыслення, пачуццё адказнасці перад грамадствам і добрыя веды нямецкай мовы.

Выбраныя намі ўдзельнікі каледжа атрымаюць магчымасць:

- наладзіць карысныя сувязі з вядучымі экспертамі ў галіне грамадскай, палітычнай і адміністрацыйнай дзейнасці ў Германіі і ЕС;

Rauchstraße 17/18
10787 Berlin
Tel.: +49 (0)30 25 42 31-0
Fax: +49 (0)30 25 42 31-71
info@dgap.org
www.dgap.org

DGAP

- павысіць кваліфікацыю ў галіне якасці дзяржаўнага і грамадскага кіравання і атрымаць адпаведны сертыфікат аднаго з нямецкіх універсітэтаў;
- развіць кампетэнцыі кіраўніка і пашырыць веды па праектным менеджменце;
- пазнаёміцца бліжэй з установамі ў Германіі, якія дзейнічаюць прыкладна ў той жа галіне, што і ўстановы, у якіх працуюць канкурсанты ў сябе на радзіме;
- стаць часткай міжнароднай супольнасці маладых лідэраў у Еўропе.

Акрамя таго, ўдзельнікі змогуць рэалізаваць у рамках праграмы каледжа свой уласны праект па павышэнні якасці кіравання ў сябе на радзіме.

Работадаўцы канкурсантаў не нясуць ніякіх выдаткаў у сувязі з удзелам іх супрацоўнікаў у праграме каледжа. Транспартныя выдаткі, выдаткі на атрыманне візы, пражыванне і большую частку выдаткаў на харчаванне, а таксама дадатковыя выдаткі, звязаныя з удзелам у семінарах, бярэ на сябе Фонд імя Роберта Боша.

Для таго, каб падтрымаць Вашага супрацоўніка пры падачы заяўкі на ўдзел у конкурсе, Вы, як непасрэдны кіраўнік, можаце напісаць рэкамендацыйны ліст (падрабязную інфармацыю наконт дадзенага ліста канкурсанты змогуць атрымаць на інтэрнэт-сайце каледжа). У выпадку, калі Вашыя супрацоўнікі будуць прынятыя для ўдзелу ў праграме каледжа, мы просім Вас даць ім магчымасць прыняць удзел ва ўсіх семінарах каледжа на працягу года. Да іх ставяцца трохтыднёвы семінар у Германіі (з 29 жніўня па 19 верасня 2015 г.), чатырохдзённы прамежкавы семінар у сакавіку 2016 г. і заключная трохдзённая сустрэча ў жніўні /верасні 2016 г. ў Берліне.

Дадатковую інфармацыю па правядзенні каледжа Вы знойдзеце ў прыкладзеным флайеры на нямецкай мове і на сайце www.goerdeler-kolleg.de.

Апошні тэрмін падачы заявак на ўдзел: 2 сакавіка 2015 г.

DGAP

З пытаннямі Вы можаце звярнуцца да спадарыні Леа Сафі Деварэцкі (E-Mail: deworetzki@dgap.org, тэлефон +49 (0) 30 254231-47), адказнай асобе па пытаннях арганізацыі каледжа ў Нямецкім таварыстве знешняй палітыкі (DGAP).

Загадзя дзякую за дапамогу.

З павагай,

праф. Гюнтэр Фэрхойген

Дырэктар каледжа

Экс-віцэ-прэзідэнт Еўрапейскай камісіі